# § 28. Рэлігійнае жыццё на тэрыторыі Беларусі

**МЯЧЭЦЬ**
**КАТАЛІЦТВА**
**ІЎДАІЗМ КАНФЕСІЯ**
**ПРАВАСЛАЎЕ**
**ЦАРКВА СІНАГОГА**
**КРЭЎСКАЯ УНІЯ КАСЦЁЛ**
**ВЕРАЦЯРПІМАСЦЬ ІСЛАМ**

**1. ВКЛ — поліэтнічная поліканфесійная дзяржава.** У адрозненне ад многіх сярэдневяковых дзяржаў Еўропы, для якіх былі характэрныя канфесійная аднароднасць і праявы нецярпімасці да носьбітаў іншых рэлігійных традыцый, у ВКЛ мірна суіснавалі прадстаўнікі розных рэлігій, праяўляючы верацярпімасць адны да другіх. Рэлігійная разнастайнасць у краіне была абумоўлена яе шматнацыянальнасцю. Поліэтнічны склад дзяржавы знайшоў свой адбітак ужо ў самой яе назве — Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае. І з гадамі калектыўны партрэт яго жыхароў рабіўся толькі больш разнастайным. На этнічных беларускіх землях у розныя часы сяліліся заходнеславянскія (палякі), балцкія (яцвягі, літоўцы, жамойты, латгалы), цюркскія (татары) этнічныя групы. Акрамя таго, на тэрыторыі Беларусі жылі яўрэі, цыганы, немцы і інш. Прадстаўнікі беларускага этнасу пераважна вызнавалі праваслаўны варыянт хрысціянства, частка балцкага насельніцтва да пачатку XV ст. прытрымлівалася язычніцтва, прадстаўнікі этнічных меншасцей мелі магчымасць захоўваць свае традыцыйныя рэлігіі.

Успомніце, калі на тэрыторыі ВКЛ з’явіліся татары і яўрэі.

**Узмацненне пазіцый праваслаўнай царквы**

**2. Праваслаўная царква ў ВКЛ.** Ад першых гадоў існавання ВКЛ праваслаўныя жыхары складалі большасць насельніцтва краіны, а з пашырэннем межаў дзяржавы іх колькасць толькі павялічвалася. У сувязі з гэтым вялікім князям літоўскім, якія ў XIII — пачатку XIV ст. прытрымліваліся язычніцтва, даводзілася шукаць кантакт з праваслаўнай царквой. Ёсць звесткі, што вялікі князь Міндоўг у пачатку свайго княжання ў Навагародку прыняў праваслаўе.

## РЭЛІГІЙНЫЯ ПОГЛЯДЫ ПЕРШАГА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ЛІТОЎСКАГА




Як вы лічыце, якімі ўнутры- і знешнепалітычнымі прычынамі была абумоўлена частая змена афіцыйных рэлігійных поглядаў Міндоўга?

Праваслаўную веру прыняў і сын Міндоўга вялікі князь Войшалк, які нават пакінуў княжацкі прастол і прыняў пострыг. Аднак яго спроба хрысціянізацыі язычніцкай Літвы ў 60-я гг. XIII ст. аказалася няўдалай. У сувязі з хуткім павелічэннем тэрыторыі ВКЛ у XIV ст. пасля ўключэння ў яго склад новых зямель хрысціяне пачалі складаць абсалютную большасць насельніцтва дзяржавы.

**Вядучая роля ў грамадска-палітычным жыцці краіны**

Праваслаўная царква мела высокі маральны аўтарытэт і адыгрывала значную ролю ў грамадскім жыцці ВКЛ. Праваслаўныя епіскапы аказвалі сур'ёзны ўплыў на мясцовых князёў, падпісвалі дамовы з іншымі княствамі і гарадамі. У сферу дзейнасці царквы ўваходзілі пытанні не толькі культурнага і духоўна-маральнага характару, але і сямейна-бытавога

жыцця: заключэнне і скасаванне шлюбаў, справы аб ерасях, блюзнерстве, распусце і інш.

**Стварэнне Літоўскай мітраполіі**

У царкоўна-адміністрацыйным плане беларускія землі ўваходзілі ў склад праваслаўнай Кіеўскай мітраполіі. Мітрапаліты займалі важнае месца пры двары маскоўскіх князёў, якія спаборнічалі з літоўскімі князямі ў справе аб'яднання зямель Старажытнай Русі. Успрымаючы гэты факт як перашкоду ў рэалізацыі сваёй унутранай і знешняй палітыкі, Гедымін у 1316 г. са згоды канстанцінопальскага патрыярха стварыў Літоўскую праваслаўную мітраполію з цэнтрам у Навагародку. Яна праіснавала да 1329 г., пасля чаго Руская мітраполія ўз'ядналася. Вялікія князі літоўскія Альгерд і Вітаўт таксама рабілі палітычна матываваныя захады аддзяліць праваслаўныя епархіі ВКЛ ад адзінай Рускай мітраполіі. Гэтыя захады прыводзілі да заняпаду або аслаблення царкоўнага жыцця і таму нязменна завяршаліся вяртаннем епархій ВКЛ пад уладу агульнарускага мітрапаліта. Перыядычна саступаючы ціску вялікіх князёў літоўскіх у жаданні атрымаць асобную мітраполію, канстанцінопальскія патрыярхі ўсё ж імкнуліся захаваць царкоўна-адміністрацыйнае адзінства Рускай мітраполіі. У 1458 адбыўся падзел раней адзінай Кіеўскай мітраполіі на дзве самастойныя структуры: мітраполія Кіеўская і ўсяе Русі, мітраполія Масквы і ўсяе Русі.

**3. Змяненне рэлігійнай палітыкі ВКЛ пасля заключэння Крэўскай уніі.** Ад другой паловы XIV ст. праваслаўная царква адыгрывала ўсё важнейшую ролю ў палітычным жыцці ВКЛ, значная частка літоўскай знаці была хрышчана паводле праваслаўнага абраду. Аднак змена знешнепалітычных прыярытэтаў краіны пасля заключэння Крэўскай уніі аказала сур'ёзны ўплыў на рэлігійнае жыццё насельніцтва, узвяла каталіцтва ў статус дзяржаўнай рэлігіі.

Успомніце, калі, чаму і на якіх умовах была заключана Крэўская унія.

**Пашырэнне каталіцызму**

Згодна з умовамі уніі вялікі князь Ягайла і значная частка вышэйшай літоўскай знаці перайшлі

з праваслаўя ў каталіцызм. У 1387 г. была праведзена хрысціянізацыя язычнікаў-літоўцаў паводле каталіцкага абраду, заснавана Віленскае каталіцкае біскупства і выдадзены прывілей, які даваў дадатковыя правы і вольнасці феадалам каталіцкага веравызнання. Праваслаўныя феадалы былі пастаўлены ў няроўнае эканамічнае становішча з феадаламі-каталікамі.

Праз каталіцтва Ягайла намагаўся зблізіцца з Польшчай, а таксама з іншымі еўрапейскімі краінамі, якія разглядалі прыхільнасць да каталіцызму як паказчык прыналежнасці да заходнееўрапейскага хрысціянскага свету. Каталіцкая вера таксама разглядалася як сродак сацыяльнай, палітычнай і ў пэўнай ступені этнічнай кансалідацыі балцкай знаці,

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Фарны касцёл Перамянення Божага ў Навагрудку. Сучасны выгляд*

Фарны касцёл Перамянення Божага ў Навагрудку — адзін з першых каталіцкіх храмаў, пабудаваных на беларускай зямлі. Заснаваны па загадзе вялікага князя Вітаўта яшчэ ў 1395 г., за больш чым 600-гадовую гісторыю ён захоўвае сведчанні пра многія падзеі:

- XV ст. Вянчанне караля Ягайлы і князёўны Соф'і Гальшанскай, ад шлюбу якіх пайшла дынастыя Ягелонаў, што правіла ў ВКЛ, Польшчы, Швецыі, Чэхіі і Венгрыі больш за 200 гадоў. *Як вы лічыце, чаму вяселле манарха дзвюх дзяржаў прайшло не ў саборы адной са сталіц, а ў правінцыйным на той час Навагародку?*
- XVIII ст. Хрышчэнне класіка рамантызму Адама Міцкевіча. *Даведайцеся, якія звесткі пра храм вялікі паэт увекавечыў у сваёй творчасці. Як называецца гэты твор?*
- XX ст. Пахаванне мошчаў 11 сясцёр-назарэтанак, расстраляных нацыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. *Знайдзіце звесткі пра прычыны расправы з навагрудскімі манахінямі і прапануйце сваё вызначэнне паняцця «духоўны подзвіг».*

*Дапоўніце інфармацыю пра падзеі, што адбываліся ў сценах храма ў розны час.*

якая намагалася супрацьстаяць беларуска-ўкраінскай шляхце краіны.

Пры падтрымцы вялікіх князёў літоўскіх была аформлена адміністрацыйная структура каталіцкай царквы. На тэрыторыі ВКЛ былі створаны біскупствы, якія дзяліліся на дэканаты, што складаліся з парафій (прыходаў на чале са святарамі). Большая частка тэрыторыі Беларусі ўвайшла ў склад *Віленскага біскупства*. Да канца 30-х гг. XV ст. у ВКЛ налічвалася 27 парафій, 12 з іх размяшчаліся на тэрыторыі Беларусі. Адначасова з імі ўзнікалі манастыры манаскіх ордэнаў францысканцаў, аўгусцінцаў, дамініканцаў і бернардзінцаў.

**Вера і палітыка**

Дзякуючы шчодрым дарункам вялікіх князёў літоўскіх каталіцкая царква хутка ператварылася ў буйнога землеўладальніка. Гэта пачало выклікаць незадаволенасць з боку не толькі праваслаўных феадалаў і духавенства, але таксама гараджан і сялян. Прыняты Ягайлам і Вітаўтам у 1413 г. Гарадзельскі прывілей яшчэ больш узмацніў пазіцыі феадалаў-каталікоў.

Гарадзельскі прывілей не толькі абвастрыў палітычную барацьбу ў краіне, але і прывёў да буйны́х унутрыпалітычных канфліктаў — напрыклад, да вайны 1432–1439 гг. Вялікія князі мусілі ўлічваць інтарэсы праваслаўных феадалаў, што знайшло юрыдычнае замацаванне ў прывілеі Жыгімонта Кейстутавіча ад *1434 г.*: праваслаўная шляхта атрымала роўныя правы з каталікамі.

Рэзкі паварот рэлігійнай палітыкі вялікіх князёў літоўскіх у бок каталіцтва, з аднаго боку, спрыяў палітычнаму і культурнаму збліжэнню ВКЛ з краінамі Заходняй Еўропы. З другога боку, ён прывёў да абвастрэння міжрэлігійных адносін у дзяржаве, узмацнення ўнутрыпалітычнай барацьбы і, як вынік, аслаблення пазіцый ВКЛ на міжнародней арэне.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Гарадзельскі прывілей 1413 г.**

«Таксама будуць усталяваны і захаваны на вечныя часы пасады, як яны ўсталяваны ў Польскім каралеўстве, а менавіта ў Вільні — віленскі ваявода і кашталян, затым у Троках і іншых месцах, дзе яны будуць карысныя з нашай волі. І нельга выбіраць на гэтыя пасады тых, хто не вызнае каталіцкай веры і не пакланяецца Святому Рымскаму Касцёлу.

Таксама нельга будзе прызначаць на сталыя пасады, такія як кашталян і іншыя, тых, хто не вызнае хрысціянскай (каталіцкай. — *Аўт.*) веры. Нельга дапускаць іх і да нашай рады, каб не было іх прысутнасці, калі абмяркоўваюцца пытанні аб дабры дзяржавы, бо часта розніца веры вядзе да розніцы намераў, і такім людзям адкрываюцца і робяцца вядомымі планы, якія варта трымаць у таямніцы».

1. *Якую ўмову ставіў Гарадзельскі прывілей для прызначэння людзей на дзяржаўныя пасады?*
2. *Ці згодныя вы, што «розніца веры вядзе да розніцы намераў»? Прывядзіце прыклады з гісторыі Беларусі, якія абвяргаюць гэтае меркаванне.*

**4. Спробы заключэння царкоўнай уніі.** Ідэя адраджэння адзінства хрысціянскай царквы ўзнікла адразу пасля яе расколу ў 1054 г. Яна была досыць папулярная і ў каталіцкім, і ў праваслаўным свеце, ды так і не была рэалізавана.

Пашырэнне каталіцтва ў ВКЛ → Абвастрэнне міжканфесійных адносін → Зацікаўленасць вялікіх князёў літоўскіх у царкоўнай уніі

Растлумачце, абапіраючыся на лагічны ланцужок, імкненне кіраўніцтва ВКЛ да царкоўнай хрысціянскай уніі.

Напрыканцы XIV ст. у ВКЛ паўстала ідэя своеасаблівай «рэгіянальнай» царкоўнай уніі. У адрозненне ад усіх папярэдніх, што прадугледжвалі аб'яднанне ўсяго праваслаўнага і каталіцкага свету, гэты праект

лічыў патрэбным падпарадкаванне папству толькі Кіеўскай мітраполіі. З дапамогай такога захаду кіраўніцтва краіны спадзявалася ліквідаваць раскол у феадальным саслоўі, умацаваць дзяржаўнае адзінства, пашырыць палітычныя, эканамічныя і культурныя сувязі з заходнім светам. Ягайла прапанаваў кіеўскаму мітрапаліту Кіпрыяну правесці ў ВКЛ царкоўны сабор для разгляду пытання аб аб'яднанні цэркваў. Той звярнуўся з гэтай прапановай у Канстанцінопаль, але станоўчага адказу не атрымаў. Праз два дзесяцігоддзі надарылася новая магчымасць вярнуцца да гэтага пытання, калі мітрапаліт Грыгорый Цамблак з вялікім пасольствам наведаў Канстанцкі сабор каталіцкай царквы. Аднак цяпер ад заключэння уніі на мясцовым узроўні рашуча адмовіўся сам мітрапаліт, палічыўшы, што гэтае пытанне павінна вырашацца на сусветным саборы.

Як вы лічыце, якое галоўнае пытанне перашкаджала аб'яднанню каталіцкай і праваслаўнай цэркваў?

Што такое царкоўны сабор?

У 30-я гг. XV ст. пад пагрозай асманскай заваёвы апынулася сэрца праваслаўнага свету — Канстанцінопаль, што ў значнай меры паўплывала на згоду канстанцінопальскага патрыярха ў 1439 г. усё ж заключыць царкоўную унію. Царкоўны сабор адбыўся ў Фларэнцыі. Аднак рэальнага аб'яднання хрысціянскай царквы не адбылося: рашэнне сабору не было прызнана ў Маскоўскім вялікім княстве, а хуткае падзенне Візантыі прывяло да канчатковага краху гэтага царкоўнага праекта.



*Мітрапаліт Літоўскі і ўсяе Русі Грыгорый Цамблак*

Феадалы і духавенства ВКЛ з асцярожнасцю паставіліся да навіны аб падпісанні уніі. Яна праіснавала ў ВКЛ да сярэдзіны 1460-х гг., калі Грыгорый Балгарын, які атрымаў ад Папы Рымскага сан мітрапаліта кіеўскага, вярнуўся пад уладу канстанцінопальскага патрыярха.

Ідэя аб'яднання каталіцкай і праваслаўнай цэркваў як сродку кансалідацыі феадалаў ВКЛ і ў далейшым узнікала неаднаразова ў сувязі з унутранымі супярэчнасцямі ў грамадстве і ростам супрацьстаяння з Маскоўскім вялікім княствам.

*У перыяд XIV–XV стст. у ВКЛ адбываліся працэсы, якія прывялі да істотных канфесійных змен. Усталяванне каталіцтва ў якасці дзяржаўнай рэлігіі прывяло да міжканфесійнага супрацьстаяння ў ВКЛ, а спробы паменшыць яго шляхам заключэння царкоўнай уніі толькі абвастрылі барацьбу. Аднак у выніку гэтых змен праваслаўная шляхта была ўраўнавана ў правах з каталікамі.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
| --- | --- |
| 1439 г. — Фларэнтыйская царкоўная унія, што стала спробай аб'яднаць праваслаўе і каталіцтва | 1434 г. — прывілей Жыгімонта Кейстутавіча, які ўраўнаваў правы праваслаўнай і каталіцкай шляхты |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якую ролю адыгрываў рэлігійны фактар ва ўнутранай і знешняй палітыцы ВКЛ?
2. Ахарактарызуйце канфесійную палітыку вялікіх князёў літоўскіх у другой палове XIII — XV ст. Вызначце гістарычныя факты (падзеі, з'явы, працэсы), якія яе абумовілі.
3. Чаму, на вашу думку, у ВКЛ была папулярная ідэя уніі каталіцкай і праваслаўнай царквы? Прааналізуйце, у сувязі з якімі падзеямі гэтая ідэя ўзнікала і якія падзеі не дазволілі яе рэалізаваць.
4. Прывядзіце аргументы, якія пацвердзяць, што рэзкі паварот у рэлігійнай палітыцы вялікіх князёў літоўскіх у бок каталіцтва паспрыяў палітычнаму і культурнаму збліжэнню ВКЛ з краінамі Заходняй Еўропы. Растлумачце, чаму ён прывёў да аслаблення пазіцый ВКЛ на міжнароднай арэне.